ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
У.У. Рыжкоў
«24» мая 2019 г.

**Дыктант з граматычным заданнем**

**10 клас**

## Пасля навальніцы

Навальніца прагучала і сплыла, абудзіўшы раніцу. Паветра пахла канюшынай, жытам. Прымешваўся водар агурковага цвету, медуніцы і спелага кмену. Поле ажыло, п'ючы дажджавую расу.

Неба было чыстае, густое і высокае. Хмары зніклі раптоўна, як і наплылі. І не раз раз'юшаны і напорысты вецер пагнаў іх у белы свет. Яны апалі тут, над палямі і лугам, дажджавымі струменямі і парай. Потым сцяклі незлічонымі раўчукамі ў лагчыны, поячы глебу прэснай і свежай спажывай-вільгаццю.

Вільготныя жыты, што паабапал дарогі, дзе-нідзе пазгіналіся пад цяжарам калосся. Жаўтаватае ад сонца поле выглядае зусім васковым. Дарога, пятляючы, губляецца сярод яго.

Лёгка дыхаць пасля дажджу, лёгка ісці. Раптоўны буйны лівень прыбівае пясок, змывае са сцежкі сухую траву і прывялыя спарышы-лісточкі дробнай канюшыны. Яны плаваюць у лужынах на мутна-жоўтай вадзе. (120 слоў)

**Граматычнае заданне**

| **1 варыянт** | **2 варыянт** |
|---|---|
| ***1. Вызначце:*** | |
| тып тэксту (дыктанта) | стыль тэксту (дыктанта) |
| ***2. Выпішыце два словы:*** ***адно, у якім напісанне супадае з вымаўленнем;*** ***другое, у якім напісанне не супадае з вымаўленнем*** | |
| з першых двух абзацаў | з трэцяга - чацвёртага абзацаў |
| ***3. Выпішыце з тэксту прапанаваную ніжэй часціну мовы і зрабіце яе марфалагічны разбор:*** | |
| назоўнік | прыметнік |
| ***4. Зрабіце сінтаксічны разбор:*** | |
| першага сказа першага абзаца | другога сказа трэцяга абзаца |